УДК 821.161.3-3:82.09

# ЛІТАРАТУРНАЯ КРЫТЫКА ЯК АДНА З МАДЭЛЯЎ УЗАЕМАДЗЕЯННЯ ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ І МАСТАЦКАЙ ПРОЗЫ

**Новік Ганна Юр'еўна**
малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуразнаўства імя Я. Купалы; магістр філалагічных навук

*Артыкул прысвечаны вызначэнню ролі крытыкі ў сучасным літаратурным працэсе, высвятленню яе асноўных жанравых прыкмет, а таксама дыферэнцыйных рыс як адной з адметных мадэляў інтэрферэнцыі дакументальнага і мастацкага дыскурсаў.*

Напісанне нон-фікшн на аснове твораў прыгожага пісьменства з'яўляецца адным з самых распаўсюджаных прыкладаў узаемадзеяння мастацкай і дакументальнай літаратуры. Пры гэтым рэферэнты не мадыфікуюцца, але трапляюць у інтэрпрэтацыйны кантэкст, дзякуючы чаму тлумачацца, рэкламуюцца, выступаюць у якасці аргумента да аўтарскіх меркаванняў, атрымліваюць суб'ектыўнае пераразмеркаванне сваіх станоўчых і адмоўных рыс. Дэталёвы аналіз мастацкіх і фактаграфічных тэкстаў ажыццяўляе такая дысцыпліна, як крытыка.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Паводле «Тэорыі літаратуры ў тэрмінах» В.П. Рагойшы, літаратурная крытыка – гэта «від літаратурнай дзейнасці, мэта якой – даць ацэнку бягучым фактам літаратуры з пункта гледжання значэння іх для сучаснасці» [1, с. 159]. Дысцыпліна выкарыстоўвае прыёмы і сродкі, уласцівыя літаратуразнаўству, публіцыстыцы і мастацкай літаратуры і сінтэзуе ў сабе многія разнавіднасці інфармацыі – ад этычнай і эстэтычнай да палітычнай і рэлігійнай. Праз гэта ў навуковым асяродку не існуе аднагалоснасці наконт яе жанравай прыроды.

Дагэтуль папулярнай з'яўляецца гіпотэза пра прыналежнасць крытыкі да адной з сумежных дысцыплін. Некаторыя даследчыкі (В.А. Каваленка, А.М. Макарэвіч, М.А. Лазарук) аднеслі яе да навукі, аргументаваўшы тым, што каштоўнасна-арыентацыйная дзейнасць прыпадабняе крытыку да літаратуразнаўства, эстэтыкі і мастацтвазнаўства. Па словах Ю.І. Сураўцава, «крытыка ўваходзіць у лік ідэалагічных з'яў грамадскай свядомасці. Гэта адрознівае яе ад любой навуковай дзейнасці» [2, с. 25]. Шэраг іншых літаратуразнаўцаў (І.В. Кандакоў, В.М. Канавалаў, В.В. Кожынаў, С.І. Чупрынін) вызначылі яе як публіцыстыку, паколькі мэтай крытыкі з'яўляецца не толькі спазнанне мастацтва слова, але і практычны ўдзел у яго быцці шляхам уздзеяння на рэцыпіента і рэтрансляцыі пэўных перакананняў.

Большасць навукоўцаў прытрымліваюцца думкі пра самастойнасць крытыкі як віду літаратурнай дзейнасці. Напрыклад, В.П. Рагойша, М.С. Каган, С.П. Белакурава, Н.Л. Елісееў і інш. адвялі ёй месца на мяжы мастацтва слова, навуковых даследаванняў і публіцыстыкі. Даследчыца Т.К. Грамадчанка адзначыла, што такое становішча сведчыць «не пра сінтэтызм і несамастойнасць крытыкі, а пра яе разнапланавасць, жанравую разнастайнасць. Пра здольнасць працаваць на сумежжы з іншымі родамі творчай дзейнасці» [3, с. 10]. Аднак разам з тым апалагеты канцэпцыі акцэнтавалі ўвагу і на дэвальвацыі мастацкіх каштоўнасцей, якія першапачаткова павінны былі ахоўвацца крытыкай. На наш погляд, нямэтазгодна зводзіць ролю крытычных тэкстаў да падрабязнага аналізу твораў мастацтва, паколькі іх немалаважная функцыя – дынамізацыя літаратурнага жыцця, аказанне ўплыву на сацыякультурны лад.

На сучасным этапе развіцця крытыка перажывае шэраг трансфармацый. У прыватнасці, словамі М. Аляшкевіч, яна «абжывае новыя сродкі масавай інфармацыі і камунікацыі, <…> выпрабоўвае новыя стылістыкі і метады ўздзеяння на масавую свядомасць» [4, с. 52]. Таму падаецца больш мэтазгодным казаць не столькі пра дэвальвацыю каштоўнасцей, колькі пра пераразмеркаванне функцый крытыкі.

У той час, як літаратуразнаўства характарызуецца акадэмічнасцю, крытыка выступае ў якасці адной з актыўных утваральных інтэнцый у вербальным мастацтве. Адсюль яе дынамічнасць, зварот да формы эсэ, часам хаатычнасць пры выбары аб'ектаў разгляду. Калі ў літаратуразнаўстве зварот да таго ці іншага твора дэтэрмінаваны прыналежнасцю яго да пэўнай канцэпцыі ці сферай навуковых інтарэсаў даследчыка, то павышанай увагай з боку крытыкі часцей за ўсё карыстаюцца навінкі кнігавыдання, якія яшчэ не атрымалі розгаласу ў грамадстве. Такім чынам адбываецца актыўнае ўздзеянне на літаратурны працэс, у тым ліку фарміраванне яго асноўных вектараў развіцця і грамадскага меркавання, што таксама з'яўляецца прыкметай публіцыстычнасці і адмяжоўвае крытычную дзейнасць ад навуковай.

Нарэшце, крытыка, у параўнанні з літаратуразнаўствам, выконвае шырэйшы спектр функцый. Польскі тэарэтык і гісторык літаратуры Януш Славінські вылучыў з іх чатыры, якія не з'яўляюцца эквівалентнымі. Пазнаваўча-ацэначная дасягаецца пры высвятленні тэмы твора і яго кампазіцыі, суаднясенні з літаратурным ці філасофскім накірункам, сузіранні тэксту ў грамадска-палітычнай перспектыве. Пастулатыўная рэалізуецца пры выбары пытанняў, якім крытык надае ўвагу. Аператыўная магчымая за кошт таго, што крытык займае пазіцыю стваральніка чытацкага рынку, ці «<…> з'яўляецца праваднiком літаратурнага спажывання. Фармулюе пастулаты, ставіць патрабаванні да творчасці» [5, с. 175], тым самым выконваючы рэкламныя, кагнітыўныя і ацэначныя функцыі. Чацвёртая функцыя крытыкі – метакрытычная. Яна выяўляецца галоўным чынам праз самарэфлексію гэтай дысцыпліны, выражаную ў здагадках і меркаваннях крытыкаў наконт ролі іх тэкстаў у грамадскім і літаратурным жыцці, асэнсаванні сваіх прыёмаў і метадаў, а таксама аўтапалеміцы. У шырокім разуменні крытыка і сама з'яўляецца металітаратурай, ці дыялогам літаратуры пра сябе. Зварот мастацтва слова да самадаследавання стварае перадумовы для самапрэзентацыі асобных крытычных тэкстаў як літаратуры і наадварот, размываючы межы між гэтымі відамі творчай дзейнасці. Асабліва слаба дыферэнцыяцыя выяўляецца ў творах эсэістычнага плану, дзе ход аўтарскай думкі не падпарадкаваны сюжэтным канонам.

Металітаратура звычайна актуалізуецца падчас змены культурна-гістарычных парадыгмаў, калі перад мастацтвам слова стаіць задача захаваць сябе як адметную семіятычную сістэму. У якасці прыкладу ўзнікнення крытыкі з самой літаратуры прывядзём імклівы рост папулярнасці «новай крытыкі» ў 60–70-я гады ХХ стагоддзя ці экспансію металітаратурных разваг у прозе, якая выявілася перадусім у тэкстах Р. Барта, У. Набокава, Х. Картасара, В. Шклоўскага, Л. Гінзбург, М. Стральцова, К. Чорнага, М. Гарэцкага і інш. У такія перыяды для літаратуры больш актуальнай становіцца не сувязь з рэальнасцю, а аўтарэферэнцыя, спалучаная з ідэяй аўтаномнасці твора ад пазатэкставай рэчаіснасці. Металітаратурныя фрагменты нярэдка сустракаюцца і ў творах аўтабіяграфічнай літаратуры, якія праз сваю дакументальнасць не могуць быць адарванымі ад рэчаіснасці. І, паколькі змест такіх тэкстаў складаецца не толькі з аўтарэферэнцыйных разваг, можна казаць не пра замыканне мастацтва слова ў сабе, але наадварот – пра яго самапапулярызацыю любымі дасяжнымі сродкамі.

Так ці інакш, дакументальным тэкстам, напісаным на аснове мастацкай літаратуры, уласціва двайная інтэрпрэтацыя: па першае, вытлумачэнне быцця, створанага пісьменнікам і ўвасобленага ў выглядзе пэўнага тэксту; па другое, стварэнне вобраза ўласна быцця дзякуючы супастаўленню пісьменніцкай інтэрпрэтацыі з рэчаіснасцю і ўяўленнямі крытыка пра апошнюю. Крытычную дзейнасць можна расцэньваць фактычна як рэцэпцыю рэцэпцыі, дзе не меншую цікавасць уяўляе метад аўтара другаснай рэцэпцыі.

Крытыка адначасова звернутая і да літаратуры, і да грамадства, таму ў якасці адной з характэрных жанравых рыс адзначым дыялагічнасць. За кошт яе, па-першае, крытык выяўляе іманентны дыялог паміж творамі, наяўнасць якога сцвярджаў яшчэ М.М. Бахцін. Па-другое, крытычны тэкст, словамі польскага літаратуразнаўцы Кшыштофа Дыбцяка, «мае на мэце стварэнне кантактаў між тым, што літаратурнае, і тым, што пазалітаратурнае. Актыўнасць крытыкі падпарадкавана пэўнаму рытму – часам бярэ энергію з грамадскага асяродка, каб зацікавіць яго літаратурай, часам бярэ энергію ў літаратурным свеце, каб «разгрузіцца» ў іншых галінах гістарычнай практыкі» [6, с. 72]. Яна дазваляе выбудаваць сістэму «пісьменнік – твор – чытач», і хоць інтэрпрэтацыя першапачатковага твора можа быць не толькі скіраванай на чытача, але і Я-цэнтрычнай, і тэкстацэнтрычнай, але прысутнасць узгаданай сістэмы суадносін выяўляецца ў любым выпадку. Дыялогавая функцыя крытыкі праяўляецца пры актуалізацыі ёй міжтэкставых сувязей, якія ў творах існуюць у патэнцыяльным выглядзе.

Рэцыпіент вынікаў крытычнай дзейнасці гіпатэтычна з'яўляецца асобай зацікаўленай, схільнай да ўспрымання інфармацыі з любой сферы жыцця, у той час як літаратуразнаўства і эстэтыка апелююць да чытача як рэлевантнага ўдзельніка жыцця навуковага / мастацкага. Паколькі ў свядомасці адрасата крытычнага твора гіпатэтычна адбываецца змена карціны свету, то такія тэксты можна разглядаць у якасці ментатыву.

Такім чынам, літаратурная крытыка – самастойная дысцыпліна, якая вызначае аксіялагічную значнасць мастацкіх твораў, іх рэлевантнасць у дачыненні да сучаснасці і выконвае пазнаваўча-ацэначную, метакрытычную, пастулатыўную, аператыўную функцыі. Крытычныя тэксты з'яўляюцца вынікам выкарыстання метадаў журналістыкі, літаратуразнаўства, а таксама метадаў, уласцівых любой пазнаваўчай дзейнасці; яны нярэдка ствараюцца ў форме эсэ і валодаюць пэўнай дынамічнасцю, будучы звернутымі і да мастацтва слова, і да грамадства. Пры гэтым іманентны дыдактызм не супярэчыць рэалізацыі дыялагічнасці. З'яўляючыся адной з са-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

мых распаўсюджаных мадэляў узаемадзеяння мастацкай і фактаграфічнай прозы, крытыка выкарыстоўвае ў якасці дакументальнай асновы ўвесь літаратурны твор разам з найбольш рэлевантным наборам фактаў / дакументаў, які ілюструе пункт гледжання даследчыка. Задзейнічаныя рэферэнты і фіктыўнага, і фактычнага модуса маюць раўназначную каштоўнасць, а аб'ектам успрымання выступае двойчы інтэрпрэтаваная рэчаіснасць.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ / В. П. Рагойша. – Мінск : Бел. энцыкл., 2001. – 383 с.

2. Суровцев, Ю. И. О научно-публицистической природе критики / Ю. И. Суровцев // Современная литературная критика: вопросы теории и методологии : сб. ст. / АН СССР, Ин-т мировой литературы им. А.М. Горького ; редкол: В. В. Кожиков (отв. ред.) [и др.]. – М., 1977. – С. 15–51.

3. Грамадчанка, Т. К. Праблемы сучаснай беларускай крытыкі / Т. К. Грамадчанка, А. С. Гурская, Л. М. Гарэлік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1996. – 217 с.

4. Аляшкевіч, М. Перадумовы трансфармацыі беларускай літаратурнай крытыкі мяжы XX–XXI стст. / М. Аляшкевіч // Веснік Мазырскага пед. ун-та. – 2010. – № 4 (29). – С. 52–56.

5. Sławiński, J. Funkcje krytyki literackiej / J. Sławiński // Prace wybrane.– Kraków : Universitas, 1998. – T.2. – S. 159–183.

6. Dubciak, K. Istota i struktura krytyki literackiej / K. Dubciak // Teksty : teoria literatury, krytyka, interpretacja. – 1979. – nr 6 (48). – S. 70–95.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова